ненька, сьцяблінка да сьцяблінкі, *рублём* вяршыцца заможнасьць. Якую ня дай Божа растрэсьці!

Гэтак, пэўна, і грошы маюць здольнасьць зьбіраць, назапашваць энэргію народу, укладзеную ў працу. Але нешта важнае, істотнае мы згубілі, растрэсьлі, калі расьцярушвае годнасьць „*рубель*". Мабыць, не адчуваем тае залатое сярэдзіны, дзе чынна й горда дзеіць сваю місію *рубель*.

# Рыба

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Рыба* — табуістычная назва больш старажытнага *гъвь*, якім у выніку сугучнасьці са словам „зваць" *рыбакі* стараліся не карыстацца.

У XX стагодзьдзі *рыба*, а дакладней, выраз „*пайсьці на рыбу*", набыў іншае табуістычнае значэньне. *Выезд на рыбу* для мужчынаў нярэдка азначае выезд на п'янку. З вудамі, *рыбнікамі*, сачкамі і іншым *рыбацкім* прычындальлем бяруць яны яшчэ пляшачку горкай і адпачываюць недзе на беразе возера ці рачулкі. Адпачываюць ад жыцьця, дзе ў спробе разьвязаць свае праблемы, почасту даводзіцца *біцца як рыба аб лёд*. Цешацца прывідам свабоды. *Чуюцца як рыба ў вадзе*, а сапраўдная *рыба* — тут ужо, казаў той, справа дзясятая.

Усім знаёмыя выразы: *лавіць рыбу ў каламутнай вадзе. Ні рыба ні мяса. Ноччу рыбу ловіць* — кажуць пра дзіця, якое мочыцца ў ложак. *Прысьніць буйную рыбіну* — пра ўдачу.

Вось і ўзьядналіся — называўся гумарыстычны малюнак у адным з нумароў газэты „Літаратура і мастацтва". На малюнку вялікая *рыбіна* праглынула малую. Чытач бачыў у вялікай *рыбіне* Расею, а ў малой — Беларусь.

*Рыбак*, вудаль, вудзільшчык, вудар, *рыбалоў*.

Тыя беларусы, якія хочуць быць больш расейцамі, чым самі расейцы, кажуць: *ріба*. „Пайду пасматрю, какая там *ріба*" — фраза, пачутая мной на полацкім базары. Тым разам *рыба* была прывазная — марская.

# Рэвалюцыя

***Віталь Тарас***

Слова „*рэвалюцыя*" за савецкім часам звычайна ўжывалася побач са словам „кастрычнік". Нагадайма, што „*рэвалюцыя*" паходзіць ад лацінскага „*revolutio*", што ў перакладзе азначае „абарот, пераварот". Зьдзейсьніўшы яго, бальшавікі ахрысьцілі спакойны восеньскі месяц, калі, здаецца, прырода адпачывае, пачаткам новай эры. А каб не было сумневу, увялі дэкрэтны час і новы каляндар, паводле якога *кастрычніцкая рэвалюцыя* здарылася... у лістападзе.

Як мэлянхалічна пісаў Купала з нагоды 10-годзьдзя ўтварэньня БССР: „*Рэвалюцыя*. Воля. Верх узяў пралетарый... Беларусь, як жабрачка, брыдзе зь «бежанства» хмарай".

Імем *рэвалюцыі* раскулачвалі й высылалі зь Беларусі ў Сібір сялянаў, зьнішчалі нацыянальную інтэлігенцыю, мову, гісторыю.

Паступова *рэвалюцыя* зрабілася штампам — звычайным, шэрым, як той восеньскі дзень, калі масы людзей у шэрай вопратцы шпацыравалі пад чыр-